нятности зрителю. Так, увеличение предложения антрепризы в регионах будет содействовать приобщению различных групп населения к образцам профессионального театрального искусства, а постепенное распространение форм плейбек- и форум-театра поспособствует их (населения) творческому самовыражению в сценическом искусстве.


1. *Галак, В. А.* Новые формы в любительском театре Беларуси конца XX – начала XXI веков / В. А. Галак // Вести Института современных знаний. – 2016. – № 2. – С. 15–19.

2. *Еделева, Е.* Форум-театр. Интерактивная техника групповой работы [Электронный ресурс] / Е. Еделева // Школьный психолог. – 2004. – № 15. – Режим доступа : http://psy.1september.ru/article.php?ID=200401509. – Дата доступа : 10.09.2017.

3. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2002–2003. – Т. 1. – 2002. – 565 с.

4. Цирковая терминология : метод. разработка / Гос. училище цирк. и эстрад. искусства, Всесоюз. бюро пропаганды циркового искусства ; авт.-сост. З. Б. Гуревич. – М. : [б. и.], 1982. – 45 с.


# ГІСТАРЫЧНА СКІРАВАНЫЯ АРКЕСТРАВЫЯ ТВОРЫ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ У СВЯТЛЕ МІЖЖАНРАВЫХ УЗАЕМАДЗЕЯННЯЎ


***Т. Ю. Трафімчук,***
*кандыдат мастацтвазнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*


Разгляд сімфанічных і народна-аркестравых твораў беларускіх кампазітараў апошняй трэці XX – пач. XXI ст. выявіў шматпланавасць індывідуальна-аўтарскіх падыходаў да рашэння гістарычных вобразаў у буйных музычных жанрах. Цэлы пласт музычнай творчасці айчынных аўтараў апынуўся кансалідаваны вакол эпохі Сярэдневякоўя.

Асаблівасці скіраваных да тэмы Сярэдневякоўя аркестравых твораў ярка праявіліся на ўзроўні міжжанравых узаемадзеянняў, што звязана, па-першае, са спецыфікай гістарычнага развіцця беларускіх аркестравых жанраў, а па-другое, з асаблівасцямі рознажанравых карэляцый у музычным мастацтве Беларусі апошняй трэці XX – пач. XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле агульнапрынятай музыказнаўчай перыядызацыі гісторыя нацыянальнага сімфанізму ўтрымлівае некалькі перыядаў: 1920-я – пачатак 1930-х гг.; 1932–1940-я гг.; 1941–1945 гг.; 1946–1960 гг.; з 1960-х гг. [2]. У развіцці беларускай народнааркестравай творчасці навукоўцы вылучаюць чатыры перыяды: зараджэнне – 1900–1925 гг.; станаўленне – 1925–1955 гг.; прафесіяналізацыя і акадэмізацыя – 1955–1975 гг. і зацвярджэнне мастацкай самастойнасці і прызнанне эстэтычнай каштоўнасці – 1975–2000-я гг. [5]. Кожны з гэтых перыядаў адметны, з аднаго боку, выразнасцю канкрэтных музычна-аўтарскіх выказванняў, пры якіх творчасць асобнага кампазітара выступае «вядучай адзінкай, рэальным фактам гістарычна-музычнага працэсу, матэрыялізацыяй <…> грамадскай мастацкай (музычнай) гістарычнай свядомасці і яе прыватным выразам» [3, с. 18]. З другога боку, свае акцэнты растаўляе пастаяннае творчае пераасэнсаванне і пераўтварэнне парадыгматыкі буйнамаштабных аркестравых жанраў, для якіх прынцыповае значэнне маюць «узровень зместу твора ў цэлым, а таксама ўзровень цэласнай рэпрэзентацыі мастацкага зместу ў працэсе разгортвання і крышталізацыі формы цэлага» [1].

Асаблівасці рознажанравых карэляцый у музычным мастацтве Беларусі апошняй трэці XX – пач. XXI ст. звязаны з актуалізацыяй у беларускай мастацкай культуры тэндэнцыі гістарызму з ярка акрэсленым вектарам Сярэдневякоўя. У творчасці айчынных кампазітараў яна пачала рэалізоўвацца перш за ўсё ў жанрах сімфоніі, паэмы, фрэскі для сімфанічнага і народнага аркестра.

Прыкметнасць дадзенай сітуацыі склаў той «жанравы парадокс», які ўтварыўся насуперак універсальнаму закону функцыянавання музычных жанраў [4]. Паводле яго вядучыя ідэйна-эстэтычныя інтэнцыі і тэматычна-вобразныя прыярытэты пэўнай эпохі або культурна-гістарычнага перыяду першапачаткова праяўляюць сябе, а далей зацвярджваюцца і развіваюцца пераважна ў тэатральна-сцэнічных сачыненнях. Да такіх жанраў, якія ўтрымліваюць яркі рэпрэзентатыўны кампанент, адносяцца опера, меса, кантата, араторыя, балет.

У беларускім музычным мастацтве 1970–2000-х гг. менавіта «бязмоўныя» сімфанічныя і народна-аркестравыя сачыненні з’явіліся аднымі з першых выразнікоў цікавасці кампазітараў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да культурнага дыялогу з эпохай Сярэдневякоўя, а таксама сталі тымі ўзорамі, якія шматмерна раскрылі і канцэптуальна абагульнілі мастацкія разважанні пра гістарычны шлях і багатую духоўную спадчыну Беларусі. Такім чынам, яны перанялі тую пасіянарную функцыю (сумежную ў дадзеным выпадку з функцыяй замяшчэння), якую ў іншых сацыяльна- і культурна-гістарычных варунках маглі б выканаць музычна-тэатральныя творы. Пры гэтым відовішчна-неабходныя слоўны і сцэнічны кампаненты ў пэўным сэнсе не былі цалкам згублены ў жанрах «чыстай» музыкі.

Слоўны кампанент кампенсаваўся высокай дзеллю нарратыўнасці музычных тэкстаў, звернутых да Сярэдневякоўя. Яна праявілася ў рознага кшталту вербальных пазначэннях: праграмах, аўтарскіх рэмарках з адсылкамі да знакамітых гістарычных постацей, важных падзей, сакральных топасаў беларускай даўніны (Ефрасіння Полацкая, Грунвальдская бітва, Крэўскі замак, Сафійскі сабор, Каложская царква), а таксама ў шырокім выкарыстанні ў вакальна-інструментальных творах радкоў са старадаўніх хронік, кніг (да прыкладу, у другой аркестрава-харавой частцы сімфоніі «Полацкія пісьмёны» у раздзелах «Грамота», «Азъ веди», «Книга» і «Мудра» А. Мдзівані цытуе тэксты са Слоўніка XI–XVII стст., а таксама з «Помнікаў літаратуры Старажытнай Русі» X–XI стст.).

Сцэнічны кампанент раскрыўся ў экстрамузычнай скіраванасці многіх аркестравых сачыненняў, дзе вобразны свет старажытнай эпохі знаходзіць увасабленне праз тонка прадуманую драматургію, якая знутры ўзбагачаецца шматстайнымі інтэртэкстуальнымі перакрыжаваннямі, мастацкай сімвалізацыяй жанраў, музычных тэм, інтанацый, тэмбраў, вербальнай складаючай. Да прыкладу, у музычным тэксце сімфоніі «Каложа» В. Войціка, у якім аўтар метафарычна перадае «сітуацыю ўнутранага разлому», важнае сімвалічнае значэнне набываюць семантычнасць тэматызму ў цэлым («станоўчыя» па вобразным змесце тэма ўступу, тэма пабочнай партыі I часткі і тэма II часткі; «адмоўныя» тэма галоўнай партыі I часткі, тэмы і тэматычныя ўтварэнні III часткі), жанравасць асобных тэм (фанфарнасць, малітоўнасць і маршавасць), іх інтанацыйная аснова (дыятанічнасць і храматыка) і тэмбравае рашэнне (семантычная палярызацыя тэмбраў струнных, духавых, ударных інструментаў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ адна важная – стымулюючая функцыя аркестравых твораў, прысвечаных эпосе Сярэдневякоў, вызначылася тым, што яны не толькі храналагічна апярэдзілі, але ў пэўнай ступені падрыхтавалі з'яўленне сачыненняў у іншых жанрах. Істотна, што менавіта ў дадзенай галіне склаліся тыя мастацка-стылёвыя рысы, якія з'явіліся характэрнымі для многіх гістарычных беларускіх опер, балетаў, кантат, араторый, камерна-вакальных і інструментальных опусаў апошняй трэці XX – пач. XXI ст. Найбольш паказальнымі сталі: асобае, паважліва-рамантызаванае стаўленне да старажытнай эпохі з характэрным умоўна-фантазійным змястоўна-вобразным напаўненнем твораў; арыентацыя на класіка-рамантычныя (па форме, стылю) узоры; вялікая роля індывідуальна-аўтарскага выказвання, зварот да нацыянальна-знакавай культурна-гістарычнай сімволікі.

Такім чынам, сімфанічныя і народна-аркестравыя творы, прысвечаныя гістарычнай тэме і асабліва вобразам эпохі Сярэдневякоўя, вылучаюцца ў асобны пласт творчасці ў святле міжжанравых узаемадзеянняў XX – пач. XXI ст. Іх асобае месца абумоўлена як асаблівасцямі гістарычнага развіцця аркестравых жанраў у цэлым, так і спецыфічнымі мастацка-жанравымі функцыямі – пасіянарнай, замяшчальнай, стымулюючай.

1. *Аксенов, В.* Размышления о жанре как научном понятии и парадигме художественного творчества (на примерах из современной симфонической музыки) [Электронный ресурс] / В. Аксенов // Российская академия музыки имени Гнесиных. – Режим доступа : http://2010.gnesinstudy.ru/wp-content/uploads. – Дата доступа : 25.03.2015.

2. *Волкова, Л. А.* История белорусской музыки XX века. Симфония : учебн. пособие / Л. А. Волкова. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2010. – 159 с.

3. *Друкт, А. А.* Типологические черты развития белорусской современной музыки (постановка проблемы): исследование / А. Друкт. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 1992. – 35 с.

4. *Конен, В. Д.* Театр и симфония. Роль оперы в формировании классической симфонии / В. Д. Конен. – М. : Музыка, 1968. – 351 с.

5. *Яконюк, Н. П.* Народно-инструментальная музыкальная культура письменной традиции в Беларуси: опыт системного анализа / Н. П. Яконюк. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры, 2001. – 269 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ